# <u>Узор</u> пазоўнай скаргі аб сцвярджэнні несапраўднасці сужэнства

*Мясцовасць, дата*

**У Міждыяцэзіяльны**
**Касцёльны Суд у Мінску**
вул. Рэвалюцыйная, 1А
220030 г. Мінск

**Пазоўнік(-ца)** Прозвішча (*калі жанчына – ў дужках пазначыць <u>дзявочае</u> прозвішча*); імя, імя па бацьку; дата нараджэння, Ахрышчаны/-на дата (год) і месца хросту; дакладны адрас для карэспандэнцыі з паштовым індэксам; актуальныя нумары тэлефонаў. (*Калі каталік – дадаць назву парафіі, да якой належыць*).

**Адказчык(-ца)** Прозвішча (*калі жанчына – ў дужках пазначыць <u>дзявочае</u> прозвішча),* імя, імя па бацьку; дата нараджэння, дата і месца хросту; дакладны адрас пражывання з паштовым індэксам; нумары тэлефонаў. (*Калі каталік – дадаць назву парафіі, да якой належыць*).

Шчыра прашу Касцёльны суд у Мінску аб сцвярджэнні несапраўднасці майго сужэнства заключанага (*<u>дата</u> заключэння сужэнства*) у парафіі (*<u>назва</u> і <u>горад</u> парафіі*).

Я лічу што маё сужэнства несапраўднае па прычыне (прычынах): (*неабходна падаць прычыны несапраўднасці сужэнства, якія адносяцца да Вашай справы. Напрыклад:*

- няздольнасці да прыняцця на сябе істотных сужэнскіх абавязкаў з боку мужчыны (жанчыны) па прычынах псіхічнай прыроды,
- выключэння адзінства і неразрыўнасці сужэнства з боку мужчыны (жанчыны),
- выключэння патомства з боку жанчыны (мужчыны),
- прымусу, боязі з майго боку альбо з боку сужонка,
- псіхічнай хваробы,
- імпатэнцыі,
- недахопу ў распазнанні істотных сужэнскіх правоў і абавязкаў з боку жанчыны (мужчыны),
- палавога бяссілля,
- памылкі адносна распазнання канкрэтнай якасці характару асобы (падаць якой якасці),
- падману з боку мужчыны (жанчыны) (*перад вянчаннем),*
- альбо іншыя прычыны, такія як алкагалізм, нарказалежнасць, гомасексуалізм, транссексуалізм, педафілія і г.д.

*Далей трэба апісаць у форме* <u>*апавядання*</u> *акалічнасці, перш за ўсё перад шлюбам, а таксама пасля шлюбу. Трэба звярнуць увагу на прычыну несапраўднасці сужэнства, на сур'ёзныя праблемы перад і падчас супольнага жыцця, і на прычыны распаду сям'і. Ніжэй пададзеныя пытанні дапамогуць Вам напісаць пазоўную заяву больш змястоўна:*

- Калі, дзе і пры якіх абставінах бакі пазнаёміліся?
- Як доўга сустракаліся перад шлюбам і як бакі ставіліся да сябе ў гэтым часе (ці адорвалі сімпатыяй, ці давяралі адно аднаму, ці былі цялесныя збліжэнні)? Ці былі сур'ёзныя канфлікты перад шлюбам?
- Ці былі верныя адно аднаму перад шлюбам?
- Ці бакі заключалі сужэнства ахвотна, дабравольна і з любові, а калі неахвотна, недабравольна, з прымусу і без любові, то якімі матывамі кіраваліся? Калі хтосьці прымушаў, то хто, калі і чым пагражаў?
- З якога асяроддзя і з якой сям'і паходзіць кожны з бакоў (ці гэта сям'я поўная\разбітая, каталіцкая\праваслаўная, атэістычная, практыкуючая\непрактыкуючая веру, без залежнасцяў і паталогіяў\абцяжараная паталогіяй – якой паталогіяй)?
- Які характар мае пазоўніцкі бок, а які адказчыцкі?
- Ці былі паміж нарачонымі сур'ёзныя сваркі і ці былі расставанні? Калі так, то па якой прычыне (дакладна апісаць сітуацыі). Ці перад шлюбам заўважалі схільнасць да алкаголю, наркотыкаў, ці іншых злоўжыванняў або залежнасцяў, нейкіх неадэкватных паводзінаў з боку адказчыка ці пазоўніка.
- Як адбылося заключэнне грамадзянскага саюза у ЗАГСе? Ці перадшлюбныя фармальнасці былі вырашаныя ў той жа самай парафіі, дзе адбыўся касцёльны шлюб, а калі не, то ў якой (назва парафіі, адрас і дата)? Як адбыўся касцёльны шлюб? Ці не здарылася штосьці асаблівае? Дзе адбылося вяселле і якая была там атмасфера?
- Ці бакі пасля шлюбу дапоўнілі сваё сужэнства праз цялесныя збліжэнні і ці маюць сваё патомства? Калі не, то па якой прычыне? Ці мела месца свядомае выключэнне патомства, а калі так, то ад якога моманту? Ці быў хто-небудзь з бакоў бясплодным (імпатэнтам)?
- Дзе і ў якіх умовах бакі пачалі жыць пасля заключэння шлюбу? Як выглядала жыццё бакоў пасля шлюбу? Ці бакі дбалі пра сябе ўзаемна і пра сваю сужэнскую супольнасць? Ці бакі былі самастойныя ў прыняцці важных жыццёвых рашэнняў? Ці залежалі ад іншых асоб - калі так, то ад каго, у якой ступені і ў чым гэта праяўлялася?
- Калі (падаць прыблізна даты), пасля касцёльнага шлюбу, даходзіла да непаразуменняў і што было іх прычынай? Дакладна апісаць сітуацыі, якія прывялі да рашэння аб разводзе.
- Хто з бакоў першы пакінуў сям'ю, калі (падаць даты, можна прыблізна) і чаму?
- Хто і з якой прычынай звярнуўся ў дзяржаўны суд аб разводзе? Колькі фактычна пражылі разам да разводу?
- Ці цяпер існуе магчымасць прымірэння паміж бакамі і працяг супольнага сужэнскага жыцця? Калі не, то чаму?

На пацвярджэнне маёй просьбы падаю наступных <u>сведкаў</u>:

*(Сведкамі могуць быць члены сям'і, сябры, знаёмыя, калегі, суседзі, якія добра ведалі бакі яшчэ перад шлюбам і ведалі пасляшлюбны час, ведалі сітуацыю. Трэба падаць двух-трох сведкаў з боку пазоўніка і двух з боку адказчыка)*

1. Імя, імя па бацьку і прозвішча, дакладны адрас пражывання з паштовым індэксам, тэлефоны, веравызнанне, кім з'яўляецца для пазоўніка(цы).
2. Імя, імя па бацьку і прозвішча, дакладны адрас пражывання з паштовым індэксам, тэлефоны, веравызнанне, кім з'яўляецца для пазоўніка(цы).
3. Імя, імя па бацьку і прозвішча, дакладны адрас пражывання з паштовым індэксам, тэлефоны, веравызнанне, кім з'яўляецца для адказчыка(цы).
4. Імя, імя па бацьку і прозвішча, дакладны адрас пражывання з паштовым індэксам, тэлефоны, веравызнанне, кім з'яўляецца для адказчыка(цы).

Беручы пад увагу (принимая во внимание) ўсё вышэй напісанае, прашу Біскупскі Суд у Мінску прызнаць маё сужэнства несапраўдным, каб я мог (магла) весці сваё жыццё ў адпаведнасці з вучэннем Касцёла і ўласным сумленнем.

____________________________________

*(уласнаручны <u>подпіс</u>)*

**Дадаць да пазоўнай скаргі:**

1. *Копію Пасведчання аб касцёльным шлюбе;*
2. *Копію рашэння дзяржаўнага суда аб разводзе;*
3. *Копію пасведчання аб хросце (калі ёсць);*
4. *Можна далучыць копію пашпарта, дзе запісана імя і прозвішча па-беларуску;*
5. *Іншыя дакументы, істотныя для справы, якія б на Вашу думку маглі б пацвердзіць несапраўднасць сужэнства (напрыклад, даведка ("справка") аб лячэнні ў шпіталі, розныя медыцынскія пасведчанні (напрыклад, заключэнне аб пабоях), даведка аб прысудзе па адміністрацыйным ці крымінальным Кодэксе, прыватная перапіска і г.д.)*

***Пазоўная скарга павінна быць раздрукаванай на прынтары на адным баку ліста – адваротны бок застаецца пустым. З левага боку абавязкова павінен быць водступ ад краю ліста памерам не менш 3 см. Пажадана пранумараваць старонкі.***

***Імёны і прозвішчы бакоў і сведкаў напісаць па-беларуску.***